УДК 902/904"20"(476)=161.3

# УНІКАЛЬНАЯ ЛІЦЕЙНАЯ ФОРМА XVII СТ. СА ЗБОРАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПОЛАЦКАГА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА

*Магалінскі Ігар Уладзіміравіч*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*старшы навуковы супрацоўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НПГКМЗ*

*Прадстаўлены вынікі даследавання ўнікальнай ліцейнай формы XVII ст. з музейнага збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Аўтар прыходзіць да высновы, што знаходка з'яўляецца ўказаннем на выкарыстанне мясцовымі рамеснікамі дастаткова складанай тэхналогіі ліцця па выплаўляемых формах, што з'яўляецца сведчаннем пераемнасці тэхналагічных традыцый з каляровай металаапрацоўкай папярэдніх перыядаў, а таксама пацвярджае агульны высокі ўзровень полацкага ювелірнага рамяства XVII ст.*

***Ключавыя словы:*** *археалогія Беларусі, ювелірнае рамяство, тэхналогіі старажытных рамёстваў.*

***Для цытавання:*** *Магалінскі, І. У. Унікальная ліцейная форма XVII ст. са збораў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка / І. У. Магалінскі // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў 2019 г.) / уклад. Т. У. Явіч; навук. рэд. Т. А. Джумантаева.— Мінск: Медысонт, 2020.— С. 150—155.*

Ліцейныя формы і тыглі з'яўляюцца важнейшым індыкатарам існавання на пэўнай тэрыторыі вытворчай дзейнасці па апрацоўцы каляровых металаў у старажытнасці. У Полацку гэтыя маркеры ювелірнай вытворчасці сустракаюцца падчас археалагічных прац у розных частках гораду. Як правіла, большасць артэфактаў не звязаныя з канкрэтным комплексам пабудоў, якія магчыма вызначыць у якасці вытворчых ювелірных комплексаў. Між тым, падобныя знаходкі з'яўляюцца непасрэдным указаннем на шырокае развіццё на тэрыторыі горада апрацоўкі каляровых металаў [1, с. 116].

У Полацку за час яго археалагічнага вывучэння знойдзена не менш 30 ліцейных форм, зробленых з каменю, гліны, рога і металу [2, с. 184]. Вытворчасць падобнага кшталту прыстасаванняў вымагала ад рамесніка ведання не толькі матэрыялу, з якога форма выраблялася, аднак і фізічных ўласцівасцяў металічнай сыравіны і яе паводзін пад уздзеяннем высокіх тэмператур [3, с. 67]. Менавіта гэтая акалічнасць дазваляе разглядаць лі-

цейныя формы ў якасці важнейшай крыніцы, якая адлюстроўвае ўзровень развіцця ювелірнай вытворчасці на пэўнай тэрыторыі ў старажытнасці.

У 2019 годзе, падчас разбору археалагічных матэрыялаў навукова-дапаможнага фонду НПГКМЗ была выяўлена ліцейная форма, якая не мае аналагаў сярод полацкіх старажытнасцей.

Выраб фрагментаваны, мае памеры 4,3×4,2×0,5 *см*, зроблены з добравымучанай белай гліны (*мал. 1*). Прадмет утрымлівае выяву адваротнага боку крыжа-цельніка з часткай малітвы «Да воскреснет Бог ...», якая можа чытацца наступным чынам — 1[Да] 2вос3кре́/с/нет Бог 4і ра(сточа́тся вра)5зи́ (Его́) ці 1[Да] 2вос3кре́/с/нет Бог 4(в)ра5зи́ (Его́)[*] (*мал. 2*); а таксама фрагмент яшчэ адной адліўкі, магчыма спражкі. Акрамя таго, на вырабе фіксуюцца фрагменты двух штыфтоў для мацавання верхняй створкі. Такім чынам, форму магчыма аднесці да тыпу раздымных, дзвюхстворкавых, закрытых, з рабочай паверхняй у дзвюх створках, літнік не захаваўся.




*Мал. 1. Ліцейная форма XVII ст.*

* Аўтар выказвае шчырую падзяку І. Л. Калечыц за дапамогу ў расшыфроўцы надпісу.




*Мал. 2. Прамалёўка надпісу на форме (выканана І. Л. Калечыц)*

Прадмет дэпашпартызаваны, што ўскладняе дакладную прывязку яго да канкрэтнага раскопу. Аднак, падчас вывучэння археалагічнага справаздачнага матэрыялу было ўстаноўлена, што артэфакт паходзіць з калекцыі археалагічных знаходак, выяўленых падчас даследаванняў 1987 г. на тэрыторыі Вялікага пасада (раскопкі С. В. Тарасава). Прадмет знойдзены ў межах 7 пласта кв. 64 на глыбіні 1,3 *м*. Квадрат 64 размяшчаўся ў паўднёва-ўсходнім вуглу раскопа, недалёка ад катлавана дома, які разбурыў частку культурнага пласта на месцы раскопу [4, с. 39]. Да гэтай яго часткі блізка размяшчаўся раскоп 2005 г., які даследаваў Д. У. Дук [5]. Менавіта падчас гэтых работ быў выяўлены вытворчы ювелірны комплекс пачатку XVII ст. да якога, на нашу думку, і трэба адносіць знаходку.

Полацкая форма прызначалася для адліўкі прамалінейнага, са злегку пашыранымі канцамі крыжа, з дугамі ў сяродкрыжжы. На тэрыторыі Полацка вядомыя дзве знаходкі крыжоў дадзенага варыянту датаваныя XVII ст. [6, с. 263]. На карысць гэтай даціроўкі гавораць і палеаграфічныя адметнасці надпісу на форме, якія найбольш характэрныя для XVII ст. [7; 8].

Найбольш верагодна, што дадзенае прыстасаванне ювеліра не выкарыстоўвалася для заліўкі металу і атрымання гатовых вырабаў, а прызначалася для адліўкі васковай мадэлі крыжа. Акрамя таго, характар выявы дазваляе казаць, што яна была сфармаваная не ў выніку адбітка, а разцом, сляды якога выразна вылучаюцца.

Полацкая форма прызначалася для адліўкі крыжа «галгофскага» тыпу, які аб’ядноўвае крыжы з галгофскай тэматыкай — вырабы з невялікім рэльефам і выявай на правым баку тыповага сямі-васьмі канечнага крыжа на падножжы (Галгофа). У іканаграфіі такіх крыжоў могуць прысутнічаць такія элементы як чэрап Адама ўнутры гары, прылады пакут па баках ад крыжа і тыповы набор надпісаў. Арнаментацыя адваротнага боку можа адсутнічаць, а можа ўтрымліваць малітву [9, с. 37].

Крыжы «галгофскага» тыпу з’яўляюцца на мяжы XIV—XV стст., аднак найбольшую папулярнасць атрымліваюць у XVI—XVII стст. [9, с. 37; 10, с. 326].

Менавіта XVI ст. даследчыкі лічаць пераломным этапам у гісторыі металапластыкі, часам узнікнення новых форм і мастацкіх матываў [10, с. 327].

Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі нам не вядомыя знаходкі ліцейных форм не толькі для адліўкі прадметаў хрысціянскага культу, аднак і ўвогуле ювелірных вырабаў, датаваныя XVII ст. Акрамя таго, падобныя прыстасаванні ліцейшчыкаў надзвычай рэдкія і на сумежных тэрыторыях.

Так, каменная ліцейная форма для адліўкі крыжоў XVII ст. сустрэта падчас даследаванняў на тэрыторыі Новага Торга ў Пскове [11, с. 28, рис. 4: 2; 12, с. 139]. Падчас вывучэння «квартала ювеліраў» на былым Зацьмацкім пасадзе Цвяры таксама знойдзены шматлікія сведчанні выкарыстання ліцейнай тэхнікі для вытворчасці прадметаў хрысціянскага культу другой паловы XVI — першай паловы XVII ст. Сярод знаходак адсутнічаюць ліцейныя формы, аднак зафіксавана сыравіна для іх вытворчасці, а таксама шматлікія знаходкі крыжоў-цельнікаў «галгофскага» тыпу (звыш 180 экз.), бракаваныя вырабы і інш. [13, с. 156; 14, с. 275].

Такім чынам, полацкая ліцейная форма з'яўляецца ўнікальнай знаходкай, якая дазваляе па-іншаму зірнуць на гісторыю ювелірнай вытворчасці Полацка XVII ст. Да гэтага часу лічылася, што ювелірная майстэрня, адкрытая ў 2005 г. на тэрыторыі Вялікага пасада, адлюстроўвала эвалюцыю масавай ювелірнай вытворчасці, якая ішла па шляху глыбокай спецыялізацыі і спрашчэння тэхналогіі, абмежаванай шэрагам найбольш простых аперацый (коўка, валачэнне і інш.) [1, с. 120]. У той жа час, знаходка формы з'яўляецца ўказаннем на выкарыстанне мясцовымі рамеснікамі дастаткова складанай тэхналогіі ліцця па выплаўляемых формах, што ўказвае на наяўнасць пераемнасці ў тэхналагічных традыцыях з полацкай ювелірнай вытворчасцю папярэдніх часоў, а таксама з'яўляецца, пакуль ускосным, пацвярджэннем таго, што тэхналагічны арсенал рамеснікаў XVII ст. у цэлым адпавядаў набору рамесных прыёмаў сярэднявечных майстроў.

Знаходка мае вялікае значэнне і ў сувязі з тым, што звычайна падчас даследаванняў ювелірных майстэрняў і вытворчых ювелірных комплексаў даследчыкам не атрымліваецца зафіксаваць сляды разбураемых ліцейных форм, што, як правіла, прыводзіла да высноў адносна абмежаванага выкарыстання рамеснікамі гэтай ліцейнай тэхналогіі.

## Спіс літаратуры і крыніц

1. Магалінскі, І. У. Вытворчыя ювелірныя комплексы старажытнага Полацка (X—XVII стст.) / І. У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі.— Мінск, 2011.— Вып. 21: Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка).— С. 115—121.

2. Магалінскі, І. У. Ліцейныя формы і тыглі для плаўкі каляровых металаў з тэрыторыі Полацка X—XVII стст. / І. У. Магалінскі // Матэрыялы па археалогіі Беларусі.— Мінск, 2011.— Вып. 21: Вывучэнне археалагічных помнікаў на тэрыторыі Полацкай зямлі (да 1150-годдзя Полацка).— С. 184—193.

3. Ениосова, Н. В. Литейные формы Гнёздова / Н. В. Ениосова // Историческая археология. Традиции и перспективы (к 80-летию со дня рождения Даниила Антоновича Авдусина).— М., 1998.— С. 67—81.

4. Тарасов, С. В. Отчёт о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 г. / С. В. Тарасов // ААНД ДНУ «Інстытут гісторыі» НАН Беларусі.— № 1014.

5. Дук, Д. У. Выратавальныя археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Вялікага пасада Полацка ў 2005 годзе / Д. У. Дук // Веснік «ПДУ». Серыя А. Гуманітарныя навукі.— 2007.— № 1.— С. 5—23.

6. Магалінскі, І. У. Металічныя крыжы-цельнікі канца X—XVIII ст. з тэрыторыі Полацка (класіфікацыя, храналогія і тэхналогія вытворчасці) / І. У. Магалінскі // Полацкі музейны штогоднік: (зборнік навуковых артыкулаў за 2011 г.) / Уклад. Т. А. Джумантаева, А. У. Шумовіч.— Полацк, 2012.— С. 252—265.

7. Иванова, О. А. Палеографическое датирование псковских нательных крестов с изображением Голгофы / О. А. Иванова, Ю. В. Колпакова // Вестник Псковского государственного университета.— 2017.— № 5.— С. 23—29.

8. Костючук, Л. Я. Надписи на Псковских нательных крестах (итоги работ по расшифровке) / Л. Я. Костючук, Ю. В. Колпакова // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 57-го заседания. Вып. 31.— М, Псков: ИА РАН, 2011.— С. 48—61.

9. Колпакова, Ю. В. Хронология псковских нательных крестов с изображением Голгофы / Ю. В. Колпакова, Л. Я. Костючук // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 62-го заседания. Вып. 32. — М.; Псков: ИА РАН, 2017.— С. 36—56.

10. Винокурова, Э. П. Металлические литые кресты-тельники XVII в. / Э. П. Винокурова // Культура средневековой Москвы: XVII в.— М: ИА РАН, 1999.— С. 326—360.

11. Подгорная, Р. Г. Исследования Нового Торга в Пскове в 2011 году / Р. Г. Подгорная, Е. В. Салмина // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В.В. Седова: Материалы 58-го заседания.— М, Псков: ИА РАН, 2013.— С. 23—38.

12. Колпакова, Ю. В. Ставрографические материалы с территории Нового Торга в Пскове / Ю. В. Колпакова, Л. Я. Костючук // Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар имени академика В. В. Седова: Материалы 61-го заседания. Вып. 31.— М: ИА РАН, 2016.— С. 135—143.

13. Персов, Н. Е. Археологические свидетельства обработки цветных и драгоценных металлов на тверском Затьмачье в эпоху средневековья /

Н. Е. Персов, Т. Г. Сарачева, В. В. Солдатенкова // Археология Подмосковья: Материалы научного семинара.— М: ИА РАН, 2011.— Вып. 7.— С. 155—167.

14. Персов, Н. Е. Средневековые ювелирные комплексы бывшего Затьмацкого посада г. Твери (по материалам раскопок 2001—2006 гг.) / Н. Е. Персов, Т. Г. Сарачева, В. В. Солдатенкова // Археология Подмосковья: Материалы научного семинара.— М: ИА РАН, 2009.— Вып. 5.— С. 268—280.

УДК 341.321.54(091)(476.5-21)"1941/1966"

# ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ПОДПОЛЬНО-ПАТРИОТИЧЕСКОЙ ГРУППЫ «АСЯ» В ГОДЫ НАЦИСТКОЙ ОККУПАЦИИ В Г. ПОЛОЦКЕ

*Нарейко Константин Александрович*
*ведущий научный сотрудник Музея боевой славы — филиала НПИКМЗ*

*В статье рассматривается деятельность партийно-комсомольского и патриотического подполья в г. Полоцке в 1941—1943 гг., в частности знаменитой подпольно-патриотической группы «АСЯ». На основании архивных документов и воспоминаний участников группы даётся анализ боевой и диверсионной работы группы, а также приводится ряд выводов и уточнений, связанных с организацией и деятельностью группы в г. Полоцке в годы нацистской оккупации.*

*Автором анализируется версия некоторых представителей партизанского движения Полотчины, а также участников полоцкого подполья о фальсификации информации деятельности группы «АСЯ».*

***Ключевые слова:*** *подпольно-патриотическая группа, нацистская оккупация, полоцкое подполье, группа «АСЯ», 3-я Белорусская партизанская бригада.*

***Для цитирования:*** *Нарейко, К. А. Деятельность подпольно-патриотической группы «АСЯ» в годы нацисткой оккупации в г. Полоцке / К. А. Нарейко // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі: (па выніках навукова-даследчай работы супрацоўнікаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў 2019 г.) / уклад. Т. У. Явіч; навук. рэд. Т. А. Джумантаева.— Мінск: Медысонт, 2020.— С. 155—167.*

Значительное место в постоянной экспозиции Музея боевой славы занимают материалы, связанные с деятельностью организованного партийно-комсомольского и патриотического подполья в г. Полоцке в суровые годы нацистской оккупации. Экспозиция, созданная в 1981—1985 гг. даёт